пры плошчах перад уязнымі брамамі, ці са слабод, што складваліся побач з горадам, каб прывабіць новае насельніцтва. П. мела жылыя і прам. функцыі (напр., абслугоўвання і адпачынку). У залежнасці ад значнасці горада П. мела ўласныя абарончыя збудаванні (Узгорскі пасад у Віцебску, 17 ст.), якія з часам станавіліся часткай агульнагар. фартыфікацыйнай сістэмы. П. станавіліся таксама паселішчы, што знаходзіліся непадалёку ад горада, але наблізіся да яго пры развіцці горадабудаўніцтва (Зарэчная слабада ў Горках, 17—18 ст.). Для П. характэрны большыя памеры пляцаў, чым у цэнтры горада, а таму меншая шчыльнасць забудовы, сціпласць і прастата архіт. вырашэнняў, наяўнасць садоў і агародаў. Аснову забудовы складалі драўляныя жылыя дамы і гасп. пабудовы. Некаторыя П. мелі ўласную рыначную плошчу (Занёманне ў Гродне, 16 ст.; Казіміраўскае ў Горках, 17 ст.; Задняпроўскае ў Дуброўне, 18 ст.). У бел. гарадах з 16 ст. П. меліся ў Мінску (*Мінскае Троіцкае прадмесце*, Ракаўскае, Ляхаўка, Старажоўка, Грушаўка, Камароўка), у Гродне (Каложа, Ласосна, Занёманне), у Магілёве (Пелагееўка), у Віцебску (Задзвінне, Задунаўе), у Полацку (Запалоцце), у Пінску (Каралін), у Гомелі (хутар Сеўрукі) і інш. У 17—18 ст. П. з'явіліся ў мястэчках (Горкі, Волма Смалявіцкага р-на).

*С.А.Сергачоў.*

**ПРАДМО́ВА**, уводны тэкст, слова да чытача ці нататка аўтара, перакладчыка, рэдактара альбо выдаўца, змешчаныя ў пачатку кнігі, асобнага літ. твора або навук. артыкула. Узнікла ў сярэдневяковай рукапіснай л-ры 10—12 ст. У Беларусі заснавальнікам жанру быў Ф.Скарына (50 П. да асобных кніг Бібліі). У 16—17 ст. набыла сінкрэтычны характар, з'яўлялася сродкам выражэння надзённых пытанняў грамадска-паліт. жыцця, важных праблем развіцця культуры (П. С.Буднага, В.Цяпінскага, М.Сматрыцкага, Л.Зізанія, Сімяона Полацкага і інш.). У 19 — пач. 20 ст. адыгрывала важную ролю ў развіцці грамадскай думкі і бел. культуры (П. Я.Чачота, Ф.Багушэвіча, Цёткі і інш.). У сучаснай л-ры ў залежнасці ад характару і прызначэння выдання (зборнік маст. твораў, манаграфія, энцыклапедыя, слоўнік і г.д.) у П. падаецца інфармацыя пра змест, гісторыю ўзнікнення, аўтара, раскрываюцца мэты выдання і інш.

*Т.Ф.Рослік.*

**ПРАКАПО́ВІЧ** Мікола [Мікалай Мікалаевіч; н. 1.11.1948, б. в. Пугачова (цяпер у межах г. Брэст)], беларускі паэт. Скончыў Брэсцкі пед. ін-т (1970). Настаўнічаў. З 1975 у тэлерадыёкампаніі «Брэст». Адначасова ў 1984—89 старшыня Брэсцкага абл. аддз. Саюза пісьменнікаў Беларусі. У паэт. зб-ках «Неад'емнае» (1982), «На кругі свае» (1986), «Мяжа надзеі» (1993) гісторыя свайго народа, роздумы над праблемамі сучаснасці, спасціжэнне сэнсу жыцця.

*Тв.:* Літары на літоўцы. Трохперсце. Мінск, 2008.

**ПРАКАПЦО́ВА** Вера Паўлаўна (н. 29.1.1947, Мінск), беларускі музыказнавец, педагог. Д-р мастацтвазнаўства (2000), праф. (1997). Скончыла Бел. кансерваторыю (1970). З 1975 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. З 1979 заг. кафедры Бел. ўн-та культуры і мастацтваў. Даследуе гісторыю і тэорыю маст. адукацыі ў Беларусі, бел. масавай песні, кампаратыўнае мастацтвазнаўства, ролю музыкі ў эстэтычным выхаванні.

*Тв.:* Музычная адукацыя ў Беларусі. Мінск, 1980; Фартэпіянныя мініяцюры беларускіх кампазітараў. Ч. 1—2. Мінск, 1994—96 (у суаўт.); Мастацкая адукацыя ў Беларусі. Мінск, 1999; Спасціжэнне майстэрства: станаўленне мастацкай адукацыі ў Беларусі. Мінск, 2006; Павел Масленников. Портрет художника в зеркале времени. Минск, 2012.

**ПРАКАПЦО́Ў** Уладзімір Іванавіч (н. 8.8.1953, в. Жгуна-Буда Добрушскага р-на), беларускі мастак, мастацтвазнавец. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (2013). Канд. мастацтвазнаўства (1984). Скончыў Віцебскі пед. ін-т (1975). З 1980 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. З 1998 дырэктар Нац.



*У.І.Пракапцоў.*

маст. музея Беларусі. Працуе ў станковым жывапісе ў жанрах партрэта, пейзажа, тэматычнай карціны. Для творчасці характэрны злучэнне суб'ектыўна-лірычнага і рацыянальна-прагматычнага пачаткаў, кампазіцыйная напоўненасць зместам, эмацыянальнасць. Сярод асн. твораў: жывапісныя палотны «Памяці Максіма Багдановіча. Апошні санет паэта» (1985), «Адам Міцкевіч. Боль паэта» (1998), «Present indefinite» («Цяперашні час», 1999), «Віцебскія мроі пра Парыж» (2000—10), «Вечнасць» (2001), «Нараджэнне дня» (2002), «Банька» (2003), «На Радаўніцу. Памяці бацькі» (2004), «Страчаны вырай» і «Аўтапартрэт» (абодва 2005), «Бацькоўскі дом» (2006—11), «Полацк. Святы дзень» (2007), «Таінства» (2008), «Вуліца майго дзяцінства» (2010), «На каляды. Раніца», «Самотнасць. Да 120-годдзя М.Багдановіча» (абодва 2011), «На Радаўніцу» (2013), «Мой Віцебск», «Неба і зямля Ф.Рушчыца» (абодва 2015); трыпціх «В.К.Бялыніцкі-Біруля» (1999); нацюрморты: «Святочны букет» (2000), «Меланхолія» (2011), «Півоні» (2012), «Восеньскі нацюрморт» (2013) і інш. Аўтар кн. «У пошуках прыгажосці і гармоніі» (1988), «Мікалай Рыжанкоў» (1989), «В.Бялыніцкі-Біруля» (2012), «Станіслаў Жукоўскі» (2012), «Фердынанд Рушчыц» (2015) і інш. Прэмія Прэзі-